Навукова-метадычная ўстанова
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

# НАРОДНЫЯ ПЕСНІ І АБРАДЫ БЕЛАРУСАЎ

Праграма факультатыўных заняткаў для X класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Абрадавая і пазаабрадавая творчасць – нацыянальнае багацце і гонар беларусаў. Яна зарадзілася ў старажытнасці і прайшла вялікі перыяд шліфоўкі, адаптацыі і духоўнага забеспячэння многіх пакаленняў народа.

Найбольш старажытная – каляндарна-абрадавая і сямейна-абрадавая паэзія. Апошняя звязана з трыма асноўнымі жыццёвымі этапамі чалавека: яго нараджэннем, шлюбам і смерцю. Хрэсьбінныя песні ўваходзяць у радзінны абрад. Яны з’яўляюцца адметнасцю беларусаў, бо найбольш развітыя і найлепш захаваліся сярод славянскіх народаў. Вялікім багаццем, разнастайнасцю і паэтычнасцю вызначаюцца вясельныя песні. Памінальная і пахавальная абраднасць і паэзія (хаўтурныя галашэнні) таксама з’яўляюцца традыцыйнымі высокамастацкімі вусна-паэтычнымі творамі.

У адрозненне ад каляндарнай і сямейна-абрадавай паэзіі пазаабрадавыя песні выконваюцца незалежна ад каляндарнай прывязкі і абрадавага дзеяння. У іх найбольш выяўлены лірычны пачатак, таму і называюцца лірычнымі, у якіх праяўляюцца разнастайныя чалавечыя эмоцыі. Гэта – гістарычныя, рэкруцкія, казацкія, чумацкія, батрацкія, прымацкія, сямейна-бытавыя, любоўныя, жартоўныя, танцавальныя песні, песні-балады і інш. Асобна вылучаецца дзіцячы песенны фальклор.

**Мэта** факультатыўных заняткаў «Народныя песні і абрады беларусаў» – паглыбленне і сістэматызацыя ведаў па абрадавай і пазаабрадавай песеннасці беларусаў. І менавіта:

- разуменне паняццяў “абрад”, “звычай”, “сямейна-абрадавы комплекс”;
- паглыбленне і сістэматызацыя ведаў па радзінных, вясельных і пахавальных абрадах і паэзіі;
- пашырэнне і падагульненне ведаў па пазаабрадавых народных песнях;
- агляд сучаснай песеннай творчасці, якая развіваецца ў народна-традыцыйнай манеры;
- сістэматызацыя ведаў пра дзіцячы песенны фальклор;

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

- практычнае развучванне лепшых узораў народна-песеннай творчасці беларусаў.

Гэты названы шэраг складае асноўны змест **задач** факультатыўных заняткаў.

Вучні павінны

*ведаць:*

змест сямейна-абрадавага комплексу, традыцыйную пазаабрадавую паэзію і дзіцячы песенны фальклор беларусаў;

асноўную літаратуру па праграме;

*умець:*

адрозніваць і адносіць народныя творы да пэўнага жанрава-відавога раздзелу фальклора (сямейна-абрадавага комплекса, традыцыйнай пазаабрадавай паэзіі, дзіцячага песеннага фальклору);

выканаць не менш трох песенных твораў;

удзельнічаць у тэатралізацыі сямейнага абраду;

падабраць літаратуру для падрыхтоўкі рэферата па праграме.

У сувязі з тым, што патрабуецца не толькі набыццё пэўных тэарэтычных ведаў, але і практычнае авалоданне вучнямі асобнымі песеннымі творамі. Варта, каб педагог меў вакальна-музычныя здольнасці, або спалучаў навучанне сумесна з такім настаўнікам-спецыялістам.

У дапамогу настаўніку створана нямала патрэбнай літаратуры, якая падаецца ў канцы кожнай тэмы. Варта тут назваць толькі асноўную: Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. Мн., 1996. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: Падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік і інш. Мн., 2000. Пазаабрадавая паэзія / А. І. Гурскі, Г. А. Пятроўская, Л. М. Салавей. Мн., 2002. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік, А. С. Емельянаў, У. М. Сысоў, М. А. Каладзінскі. Мн., 2001. Энцыклапедычныя выданні: Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Мн., 2005; 2006. Этнаграфія Беларусі. Мн., 1989; Народная культура Беларусі: Энцыкл. давед. Мн., 2002,

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Да ліку важнай дадатковай літаратуры адносяцца розныя рэгіянальныя зборнікі, якія не заўсёды ўказваюцца тут, але павінны займаць належнае месца ў падрыхтоўцы да заняткаў, бо выяўляюць неабходны рэгіянальны прынцып у навучальна-выхаваўчым працэсе. Гэта, найперш, вядомыя серыі “Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры”, што падрыхтаваны ў БДУ па абласному прынцыпу ўкладання (Брэсцкая, Гомельская, Мінская вобласці); “Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 тамах”, што рыхтуецца ў Інстытуце праблем культуры; “Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі” (145 тамоў), а таксама іншыя зборнікі, выдадзеныя універсітэтамі, абласнымі і раённымі аддзеламі культуры, асобнымі творцамі (З. Я. Мажэйкай, Т. Б. Варфаламеевай, У. І. Раговічам і інш.).

Практычныя заняткі пададзены для ўзору. Настаўнік сам плануе іх тэматыку і віды дзейнасці, форму заключна-падагульняючых заняткаў, робіць падбор тэкстаў песень для развучвання (не менш трох). Праграма рзлічана на 33 гадзіны.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Назва тэмы | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | тэарэтычн. | практычн. |
| 1 | Абрады, іх паняцце і сістэматызацыя. Сямейна-абрадавы комплекс | 1 | |
| 2 | Радзінныя звычаі, абрады і песні | 1 | 1 |
| 3 | Вясельная абраднасць і песні | 2 | 2 |
| 4 | Пахаванне і хаўтурныя галашэнні | 1 | 1 |
| 5 | Пазаабрадавая паэзія. Гістарычныя песні | 1 | 1 |
| 6 | Балады | 1 | 2 |
| 7 | Сацыяльна-бытавыя песні | 1 | 1 |
| 8 | Песні пра каханне і сямейна-бытавыя песні | 1 | 1 |
| 9 | Жартоўныя песні і прыпеўкі | 1 | 2 |
| 10 | Карагодныя, танцавальныя і гульнявыя песні | 2 | 3 |
| 11 | Развіццё фальклорных традыцый у сучаснай творчасці народа | 1 | 1 |
| 12 | Дзіцячы песенны фальклор | 1 | 2 |
| 13 | Заключна-падагульняючыя заняткі | | 2 |
| | | 14 | 19 |
| | *Усяго* | **33** | |

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## ЗМЕСТ

### 1. Абрады, іх паняцце і сістэматызацыя. Сямейна-абрадавы комплекс

Абрады як частка традыцыйна-бытавой культуры і сукупнасць сімвалічна-знакавых дзеянняў. Адлюстраванне звычаяў і вераванняў. Паходжанне абрадаў і паэзіі. Паняцце "звычая". Каляндарная, сямейная і аказіянальная абраднасць. Варыятыўнасць сістэматызацый. Абрады рэлігійныя, вытворчыя, сямейна-бытавыя і грамадзянскія. Звычаі і абрады, звязаныя з будаўніцтвам хаты і асваеннем жылля, капанннем калодзежа і інш.

Сямейна-абрадавы комплекс (радзіны, хрэсьбіны, вяселле, пахаванне і памінанне) і яго паэзія.

*Літаратура*


Бабчанок М. А., Лозка А. Ю. Аказіянальныя абрады // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Мн., 2005. Т.І. С. 46.

Беларуская вусна-паэтычная творчасць: Падруч. для студэнтаў / К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік і інш. Мн., 2000.

Беларускія народныя абрады / Склад. і навук. рэд. Л.П.Касцюкавец. Мн., 1994.

Восточнославянский фольклор: Слов. науч. и нар. терминологии. Мн., 1993.

Коваль У. І., Новак В. С. Беларускія народныя святы і звычаі. Гомель, 1993.

Народная культура Беларусі: Энцыкл. давед. / Пад агул. Рэд. В. С. Цітова. Мн., 2002.

Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік, А. С. Емяльянаў, У. М. Сысоў, М. А. Каладзінскі. Мн., 2001.

Фядосік А. С. Беларуская сямейна-абрадавая паэзія. Мн., 1997.

Чистов К.В. К классификации обрядов жизненного цикла // Язычество восточных славян. Л., 1990.

Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989.


### 2. Радзінныя звычаі, абрады і песні

Радзінныя звычаі і абрады. Уяўленні і вераванні, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны і паспяховым завяршэннем родаў. Звычаі і абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці: перад родамі, дапамога пры родах, з'яўленне на свет, дзяўчынка або хлопчык. Роля бабкі-павітухі. Першае купанне, кармленне. Адведкі, выбар кумоў.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Радзіны (хрэсьбіны, хрысьціны, ксьціны). Звычаі і абрады, што папярэднічаюць хрышчэнню. Імянарачэнне. Застолле. «Перапіванне» кумоў. «Бабіна каша». Пераапрананні. «Бусел». Зычэнні. Абмен падарункамі. Абрад «цягання бабы на баране», ачышчэння ўсіх прысутных.

Абрады і звычаі першага кроку, слова, з'яўлення першага зуба, пастрыжэння. Радзінная паэзія – адметная рыса беларускага фальклору. Заклінальныя, велічальныя, жартоўныя і застольныя песні. Вобразы дзіцяці, парадзіхі, бабкі, бацькі.

*Практычныя заняткі*

Пытанні семінара.

Радзінныя звычаі і абрады. Бабка-павітуха ў радзінным абрадзе. Звычаі хрышчэння і радзін. Радзінная паэзія. Як даваліся імёны. Гісторыя твайго імені.

Запісаць рэдкія імёны вашай мясцовасці і даць спробу іх тлумачэння (хрысціянскае ці мясцовае паходжанне). Кім – Камуністычны інтэрнацыянал моладзі. Варлен – У (в) армію Леніна. Марлен – Маркс, Ленін. Луіджы – “Ленин умер, но идеи живы”. Віль – У (В). І. Ленін. Лапанальда – лагер папанінцаў на (і)льдзіне. Фэд – Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі.

Напісаць радавод сваёй сям’і.

*Літаратура*

Кухаронак Т. І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX—XX ст. Мн., 1993.

Радзінная паэзія / Склад. М. Я. Грынблат, В. І. Ялатаў. Мн., 1971.

Радзіны: Абрад. Песні / Уклад. Г. А. Пятроўская, Т. І .Кухаронак. Мн., 1998.

Сысоў У. М. З крыніц спрадвечных. Мн., 1977.

### 3. Вясельная абраднасць і песні

Паходжанне вясельнага абраду і яго сутнасць. Этапы вяселля: сватанне, заручыны, каравай, зборная субота, пасад, расплятанне касы, выезд маладога, вянчанне, вяселле ў маладога і маладой, пярэзвы і інш. Адлюстраванне рэшткаў старажытных вераванняў, формаў шлюбу. Роля хлеба на вяселлі. Багацце каравайнага абраду.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Багацце вясельных песень. Іх тэматычны змест. Сіроцкія матывы. Мастацкія вобразы, сімволіка і паэтыка. Сучаснае вяселле.

*Практычныя заняткі*

Пытанні семінара (па вызначэнні настаўніка).

Развучванне вясельных песень.

Апытванне дарослых, якія яны ведаюць традыцыйныя вясельныя чыны і што яны азначаюць, або выпісванне іх з тэкстаў абрадавых песень (маршалак, дружка, каравайніца, сват, музыка, свяцёлка, пасцельніца, завівальніца, прыданкі, заручнікі, падстрыжанка, кубельнік і інш.).

Вясельная сімволіка. Што азначае ў вяселлі рабіна, сасна, явар, сокал, галубы, перапёлка, сонца, месяц і інш.?

Запіс вясельных тостаў, зычэнняў.

Складанне лібрэта каравайнага абраду.

*Літаратура*

Валодзіна Т. В. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў. Мн., 1999.

Вяселле: Абрад /Склад. К. Цвірка. Мн., 1978.

Вяселле: Мелодыі /Склад. З. Я. Мажэйка. Мн., 1988.

Вяселле: Песні: У 6 кн. / Склад. М. Л. Малаш, З. Я. Мажэйка. Мн., 1980—1988.

Вяселле на Гомельшчыне: Фальклорна-этнаграфічны зборнік / Уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. Гомель, 2003.

Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2001.

Лірыка беларускага вяселля /Уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1979.

Палескае вяселле /Уклад. і рэд. В. А. Захаравай. Мн., 1984.

Раговіч У.І. Песенны фальклор Палесся: У 3 т. Т.2. Мн., 2002.

### 4. Пахаванне і хаўтурныя галашэнні

Паходжанне галашэнняў і абрадаў. Іх сувязь з вераваннямі. Смерць чалавека і рытуальныя дзеянні, звязаныя з яго пахаваннем. Цыклы галашэнняў і іх змест. Галашэнні па бацьку, маці, мужу, сыну, дачцы, дзеду. Імправізацыя і паэтыка ў тэкстах галашэнняў.

*Практычныя заняткі*

Пытанні семінара (па вызначэнні настаўніка).

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Наведанне мясцовых могілак. Выяўленне найбольш старадаўніх пахаванняў, традыцыі месца ўстаноўкі крыжа (у галаве, нагах).

Апытанне дарослых аб традыцыі правядзення Радаўніцы, Дзядоў

*Літаратура*

Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2000.

Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / Уклад. У. А. Васілевіч, Т. Б. Варфаламеева. Мн., 1986.

Сысоў У.М. Беларуская пахавальная абраднасць: Структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння. Мн., 1995.

**5. Пазаабрадавая паэзія. Гістарычныя песні**

Жанры пазаабрадавай паэзіі, іх тэматычны і практычны змест. Азначэнне і класіфікацыя.

Асаблівасці гістарычнай песні, яе сувязь з баладай. Адлюстраванне ў песнях барацьбы народа з яго ворагамі (татара-мангольскае нашэсце, турэцкі палон, Аршанская бітва, вайна 1812, 1941 – 1945 гг.).

*Практычныя заняткі*

Пытанні семінара (па вызначэнні настаўніка).

**6. Балады**

Азначэнне жанру і паходжанне балад. Запіс, даследаванне і выкарыстанне ў мастацкай творчасці. Класіфікацыя (балады з міфалагічнымі матывамі, казачныя і легендарныя, балады-загадкі, гульнёва-карагоднага складу, навелістычныя). Асноўныя сюжэты і матывы. Паэтыка.

Літаратурная балада.

*Практычныя заняткі*

Складанне зборніка загадак на аснове балад-загадак.

Праслухоўванне балад-песень.

Развучванне балад-песень.

Конкурс чытальнікаў народных і літаратурных балад.

*Літаратура*

Балады: У 2 кн. / Уклад. М. С. Салавей, Т. А. Дубкова. Мн., 1977—1978.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Гілевіч Н. С. Наша родная песня. Мн., 1968.
Пазаабрадавая паэзія / А. І. Гурскі, Г. А. Пятроўская, Л. М. Салавей. Мн., 2002.
Салавей Л. М. Беларуская народная балада. Мн., 1978.
Штэйнер І.Ф. Беларуская балада. Вытокі жанру і паэтычная структура. Мн., 1989.

**7. Сацыяльна-бытавыя песні**

Асаблівасці песеннага цыклу. Творчасць сялян, якія займаліся адыходніцкім рамяством. Нядоля, жабрацтва, несправядлівасць як асноўная тэма песень.

Антыпрыгонніцкі матыў. Паднявольная праца селяніна, жорсткая эксплуатацыя яго панам, папом і падпанкамі. Гора і нядоля ў антыпрыгонніцкіх песнях.

Рэкруцкія, салдацкія і казацкія песні. Набор у рэкруты, паказ розных этапаў салдацкай службы, зварот да хаты, смерць, асуджэнне вайны і несправядлівасці – тэмы салдацкіх песень.

Бурлацкія (стругоўскія), чумацкія і батрацкія песні. Іх асаблівасці ў Беларусі.

*Практычныя заняткі*

Пытанні семінара (па вызначэнні настаўніка).

Праслухоўванне запісаў сацыяльна-бытавых песень і іх развучванне.

*Літаратура*

Петровская Г. А. Белорусские социально-бытовые песни. Мн., 1981.
Сацыяльна-бытавыя песні / Уклад. І. К. Цішчанка, В. І. Скідан, Г. В. Таўлай. Мн., 1987.

**8. Песні пра каханне і сямейна-бытавыя песні**

Спецыфіка любоўных песень. Вобразы дзяўчыны і хлопца. Паэтызацыя пачуцця кахання, асуджэнне здрады. Сацыяльныя матывы. Народная мараль і этыка ў любоўных песнях.

Сямейна-бытавыя песні. Жыццё замужняй жанчыны ў чужой сям'і. Тэматыка песень: гаротны замуж, успамін пра бацькоўскі дом і мару пра

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

сустрэчу з роднымі, сям'я мужа і яе адносіны да нявесткі, няўдалы і дэспатычны муж, жонка-няўдаліца, удовіны і сірочыя песні.

*Практычныя заняткі*

Праслухоўванне запісаў песень і іх развучванне.

*Літаратура*


Варфаламеева Т. Б. Песні Беларускага Панямоння. Мн., 1998.

Вянок беларускіх песень / Зап. У.Раговіч. Мн., 1988.

Гілевіч Н. С. Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Слова і вобраз. Павэтычны сінтаксіс. Гукапіс і рыфма. Мн., 1975.

Гурскі А. І. Семантыка і паэтыка сямейнай лірыкі. Мн., 2001.

Гурскі А. І. Тайны народнай песні. Мн., 1994.

Лірычныя песні / Уклад. Н. С. Гілевіч. Мн., 1978.

Песні пра каханне / Склад. І. К. Цішчанка, С. Г. Нісневіч. Мн., 1978.

Песні сямі вёсак: Традыцыйная народная лірыка Міншчыны / Уклад. Н. С. Гілевіч. Мн., 1973.

Сямейна-бытавыя песні / Склад. І. К. Цішчанка, Г. В. Таўлай. Мн., 1984.


## 9. Жартоўныя песні і прыпеўкі

Асаблівасці жартоўных і сатырычных песень. Паказ іх вобразаў: недарэчнага мужа, няўдалай жонкі, іншых членаў сям'і, высмейванне розных заганаў у характары і паводзінах людзей. Песні пра жывёл, звяроў, птушак і насякомых. Сацыяльныя матывы ў жартоўных песнях.

Прыпеўкі. Паняцце жанру. Каханне як асноўная тэма прыпевак. Бытавыя матывы. Сатыра і гумар. Лёс прыпеўкі ў наш час. Вялікая Айчынная вайна ў прыпеўках. Прыпеўкі літаратурнага паходжання, аўтарскія і самадзейныя. Мастацкія асаблівасці. Паралелізм і сімволіка.

*Практычныя заняткі*

Развучванне жартоўных песень і прыпевак.

Конкурс на лепшага выканаўца і складальніка прыпевак.

*Літаратура*


Беларускія частушкі / Склад. К. П. Кабашнікаў, І. К. Цішчанка. Мн., 1960.

Жартоўныя песні / Склад. І. К. Цішчанка, С. Г. Нісневіч. Мн., 1974.

Прыпеўкі / Уклад. І. К. Цішчанка, Л. М. Фёдараў. Мн., 1989.

Фядосік А. С. Трапным народным словам. Мн., 1971.


Скачено с Образовательного портала www.adu.by

### 10. Карагодныя, танцавальныя і гульнявыя песні

Жанравая разнавіднасць. Карагодныя і танцавальныя песні, іх сувязь з абрадамі і пазаабрадавай творчасцю народа. Тры кампаненты ў гульнявых песнях: выразныя сродкі паэзіі, музыкі і гульнявага дзеяння.

"Яшчур", "Падушачка", "Перапёлачка", "Проса", "Мак", "Лянок".

*Практычныя заняткі*

Развучванне карагодных, танцавальных і гульнявых песень.

Фестываль гульнявых песень.

*Літаратура*

Алексютович Л. К. Белорусские народные танцы, хороводы, игры. Мн., 1978.

Гульні, забавы, ігрышчы. Мн., 1996; 2000; 2004.

Козенка М. А. Танцавальны фальклор // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Мн., 2001. Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе; Тое ж // Там жа. Мн., 2004. Т. 2. Віцебскае Падзвінне.

Лозка А. Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні: Дапам. Мн., 1997.

Чурко Ю. М. Белорусский хореографический фольклор. Мн., 1990.

Чурко Ю. Вянок беларускіх танцаў. Мн., 1994.

### 11. Развіццё фальклорных традыцый у сучаснай творчасці народа

Умовы бытавання некаторых песень савецкага перыяду, створаных у традыцыйнай манеры пра рэвалюцыйную героіку, радасць стваральнай працы, ваеннае і мірнае жыццё людзей ("Бывайце здаровы!", "Ручнікі", "Гэй, байцы, вайна настала", "А у полі, полі пры зялёным гаі", "Як на нашым на Палессі", "Расцвіла калгасная зямля", "Лявоніха", "Песня пра Нёман", "Расцвітай, Палессе" і інш.). Фальклор Вялікай Айчыннай вайны (аўтарскі пачатак, перапрацоўкі). Песні "Партызаны, партызанкі", "Над Бярозай-ракой", "Песня пра Заслонава", "Ў чыстым полі, полі пад ракітай", "Балада аб партызанцы Галіне", "Бывайце здаровы!" і інш.

*Практычныя заняткі*

Выкананне сучасных фальклярызаваных песень, іх тэатралізацыя.

*Літаратура*

Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1961.

Гілевіч Н. С. Наша родная песня. Мн., 1968.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Мухаринская Л. С. Мелодический язык современной белорусской народной песни. Мн., 1966.

Песні савецкага часу / Скл. Г. А. Барташэвіч, В. І. Ялатаў. Мн., 1970.

## 12. Дзіцячы песенны фальклор

Значэнне ў жыцці чалавека народнай творчасці для дзяцей. Жанравы склад дзіцячага фальклору і яго спецыфіка. Асаблівасці калыханак, іх тэматыка і вобразнасць. Галоўныя персанажы (кот, куры, гулі, зайчык).

Творы, звязаныя з гульнёй (забаўлянкі, лічылкі, пацешкі, прыгаворкі, гульнёвыя прыпеўкі). Творы, не звязаныя з гульнёй, або маюць неактыўны ў іх пачатак.

*Практычныя заняткі*

Пытанні семінара (па вызначэнні настаўніка).

Развучванне твораў дзіцячага фальклору.

*Літаратура*

Барташэвіч Г. А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору. Мн., 1976.

Беларускі дзіцячы фальклор / Скл. А. М. Аляхновіч і інш. Мн., 1994.

Гульні, забавы, ігрышчы. Мн., 1996; 2000; 2004.

Дзіцячы фальклор / Скл. Г. А. Барташэвіч, В. І. Ялатаў. Мн., 1972.

Дзіцячы фальклор / Скл. У. А. Васілевіч, Н. Г. Мазурына. Мн., 2006.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by